*Да 40-годдзя Перамогі*
*савецкага народа*
*ў Вялікай Айчыннай вайне*

*Рыгор Шаура,*
***кандыдат мастацтвазнаўства***

# ТВОРЧАСЦЬ ПАРТЫЗАНСКІХ САМАДЗЕЙНЫХ МАСТАКОЎ



Л. Дзятлаў. Малюнак у партызанскім часопісе «Чапаевец».

У гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі, якая была акупавана фашыстамі, дзейнічалі шматлікія партызанскія злучэнні і брыгады, асобныя палкі і атрады, у якіх распаўсюджанай формай ідэалагічнай і выхаваўчай работы зрабілася мастацкая самадзейнасць, у прыватнасці выяўленчая.

Народныя мсціўцы выдавалі аформленыя малюнкамі рукапісныя часопісы, насценныя газеты, выпускалі ілюстраваныя лістоўкі, баявыя лісткі, плакаты. Партызанская часопісная графіка была аператыўнай, камунікатыўнай, дзейснай. Друк своечасова інфармаваў людзей пра ўсе падзеі, якія адбываліся ў партызанскіх атрадах і на франтах Вялікай Айчыннай.

Ідэйная скіраванасць усяго партызанскага друку забяспечвалася гарманічнай узаемасувяззю слова і малюнка. Ілюстрацыямі да апавесцей і апавяданняў, песень, дакументальных артыкулаў і сатырычных навел былі цэлыя серыі самабытных замалёвак, танальных ці выкананых у колеры. Такі сплаў літаратуры, фальклору і выяўленчай творчасці ўзмацняў эмацыянальнае ўспрыманне таго ці іншага зместу, вабіў чытача, выхоўваў байцоў. Толькі невялікая колькасць работ была незалежная ад тэксту.

Умовам і магчымасцям самадзейнай творчасці ў гады вайны больш за ўсё адпавядала графіка, дакладней сказаць, «графіка малых форм». Рукапісныя выданні кожны дзень «ішлі» ў баявыя паходы. Таму жывапісныя палотны, скульптурныя работы, графічныя аркушы вялікіх памераў у гэтых умовах былі практычна непрымальныя.

На старонках часопісаў фіксаваліся баявыя дзеянні партызанаў, друкаваліся сатырычныя малюнкі, партрэты народных мсціўцаў, пейзажы. Усе творы дакументальныя: яны ствараліся па свежых уражаннях, уласных назіраннях. У многіх мастакоў, якія ўпершыню ўзялі ў рукі аловак ці пэндзаль, раскрыўся сапраўдны талент.

У партызанскіх рукапісных выданнях шмат малюнкаў, на якіх мы бачым батальныя сцэны — баявыя аперацыі на чыгунцы, знішчэнне калон нямецкіх аўтамабіляў, разгром гітлераўскіх гарнізонаў, сутычкі з атрадамі карнікаў і г. д. Малюнкі розныя па мастацкаму ўзроўню: адным уласціва пэўная прафесійнасць, другім — самабытнасць у кампазіцыйным і колеравым вырашэнні. Натуральна, у партызанскіх мастакоў не было шматлікіх матэрыялаў і інструментаў. У той час не пісаліся жывапісныя карціны на палатне, але такі, найбольш даступны від творчасці, як графіка, дазваляў шматгранна раскрываць гераічныя падзеі ваеннага часу.

У кожным рукапісным часопісе, а таксама ў большасці насценных газет і лістовак змяшчаюцца малюнкі, якія адлюстроўваюць баявыя аперацыі партызанаў. Напрыклад, сюжэтам для тэматычных замалёвак у часопісе «Чапаевец»[1] Л. Дзятлаў абраў два баявыя эпізоды. На першым малюнку аўтар паказаў групу партызанаў у засадзе. Яны вядуць агонь па машынах. У цэнтры мы бачым шашу, спыненыя аўтамабілі гітлераўцаў...

На другім малюнку Л. Дзятлаў паказаў ахопленыя полымем, хаатычна параскіданыя вагоны чыгуначнага саставу. Аўтар уключае ў твор своеасаблівы сімвал. На пярэднім плане мы бачым партызана з узнятым над галавой аўтаматам. Ён сімвалізуе ўсенародны гнеў і моц, ён здольны процістаяць любой сіле праціўніка. Мастак падкрэслівае масавасць партызанскага вызваленчага руху.

Артыкул палітрука 4-ай роты аднаго з атрадаў 277-га партызанскага палка Пратасава «Бой у вёсцы Казулічы»[2] праілюстраваны шасцю графічнымі работамі Г. Леня. Мастак расказвае пра арганізацыю і правядзенне баявой аперацыі па знішчэнню гарнізона нямецкіх салдатаў і паліцыі ў вёсцы Казулічы.

Пачынае выяўленчае апавяданне малюнак, на якім бачым вялікую калону партызанаў. Потым аўтар паслядоўна паказвае баявыя дзеянні і разгром гітлераўцаў. У апошнім «кадры» — калона палонных фашыстаў, якую канваіруюць узброеныя партызаны. Работы выкананы алоўкам з невялікай колеравай падмалёўкай.

Цяжкі момант адлюстроўвае мастак К. Міненка ў адной з графічных работ на старонцы часопіса «Варашылавец»[3]. Партызан Валодзя Юданаў з таварышам па зброі пад агнём выносіць з поля бою параненага камандзіра. Абяссілены і нерухомы ляжыць ён на руках сваіх байцоў. На тварах партызанаў трывога за лёс камандзіра. Выразнымі алоўкавымі лініямі пазначаны маладыя дрэўцы, за якімі разгортваецца панарама бою.

Тэматычныя кампазіцыі партызанскіх мастакоў — гэта невялікая частка нагляднa-ілюстратыўнага матэрыялу, які зберагаецца ў музеях Беларусі. Ён уяўляе сабой сапраўдную гістарычную каштоўнасць, бо рознабакова адлюстроўвае гераічную барацьбу савецкага народа ў часы вайны.

Бадай што ўсе рукапісныя часопісы ці насценныя газеты змяшчаюць партрэты народных мсціўцаў. Іх малявалі на старонках часопісаў ці на асобных аркушах у асноўным алоўкамі, часам тушшу з лёгкай падмалёўкай акварэллю. Фон, як правіла, рабілі нейтральны або з дэталямі ваеннага пейзажу, канкрэтнага месца, абстаноўкі. Сустракаюцца жанрава трактаваныя партрэты. Тут мы бачым, як партызаны вучацца валодаць зброяй, як стаяць на варце, рыхтуюцца да баявога задання, адпачываюць.

Партрэты партызанскіх камандзіраў, партызанаў-герояў па-сапраўднаму перадаюць ваенны час. Перад намі паўстаюць людзі розных узростаў і характараў. Іх яднала вялікая мэта — барацьба з фашысцкімі агрэсарамі да поўнай перамогі. Трывога і адказнасць за лёс Радзімы ў гады вайны згуртава-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

лі ўсіх савецкіх людзей у адзіную сям'ю.

Партызанскія мастакі імкнуліся выявіць у індывідуальнасці героя тыповае. Байцы і камандзіры на партрэтах — падцягнутыя, сабраныя, сканцэнтраваныя. У іх адчуваеш уласцівыя савецкім людзям мужнасць, рашучасць, гонар за сваю Радзіму.

Сярод вялікай колькасці работ партрэты, створаныя рознымі мастацкімі прыёмамі. Розняцца яны і ўзроўнем тэхнічнага майстэрства. У часопісе «Камсамол Рагачоўшчыны»[4] змешчаны тры партрэты партызанскіх камандзіраў (аўтар невядомы). На першым малюнку — партрэт камандзіра партызанскай групы А. Галашчокава. Гэта чалавек сярэдняга ўзросту, дужага фізічнага складу, з позіркам суровым і праніклівым.

На другім — камандзір партызанскага атрада С. Мальцаў. Апалены, грубаваты твар. Бачна, што па натуры чалавек спакойны, ураўнаважаны.




С. Гуткоўскі. Ілюстрацыя да артыкула А. Хмялеўскага ў часопісе «Удар з тылу».

Асаблівую ўвагу прыцягваюць партрэты камандзіраў аддзяленняў М. Горава, Н. Купрэйчыка, А. Семідзяліхіна, С. Смірнова, І. Шацілы, М. Шыкаўкі, зробленыя мастаком В. Казловым у часопісе «За Радзіму»[5]. Дэталёвая прамалёўка гэтых партрэтаў гаворыць пра тое, што аўтар імкнецца выявіць знешняе падабенства партызанаў. Усе камандзіры бадай што аднаго ўзросту. Малады М. Шыкаўка, напрыклад, намаляваны ў тры чвэрці.

У часопісе «Мсцівец» змешчаны партрэты партызанаў Х. Раскова і М. Казімірскай (мастак невядомы). Яны гераічна загінулі ў баі з фашысцкімі карнікамі. Аўтар імкнецца перадаць не толькі іх знешняе падабенства. Мы бачым, што Х. Раскоў жыццелюбівы, вясёлы чалавек. А М. Казімірская — душэўна адкрытая, добрая.

Не адзін дзесятак партрэтаў намалявалі Л. Дзятлаў і Я. Дзятлаў у часопісе «Чапаевец»[7], дзе паказаныя радавыя партызаны, медсёстры, камандзіры, старыя, дзеці. Аловак занатаваў вобразы людзей, якім выпалі цяжкія выпрабаванні. Яны прайшлі суровую школу барацьбы і перамог. Часопісы данеслі да нас вобразы народных мсціўцаў, што змагаліся ў глыбокім тыле ворага. Мастакі зрабілі партрэты камандзіра атрада (прозвішча не названае), разведчыка М. Ганчарыка, партызанаў А. Емяльянава, І. Лук'янчыка і іншых.

У партызанскім друку змяшчаліся і групавыя партрэты.

Група партызанаў намаляваная ў часопісе «Варашылавец»[8]. Народныя мсціўцы ў лесе ў поўнай баявой экіпіроўцы перад чарговым паходам. Яны ідуць на важную аперацыю, ад якой залежыць далейшы лёс іх таварышаў, вынік будучай бітвы. Аўтар намаляваў баявых сяброў у гэты хвалюючы момант паспешлівымі сціплымі штрыхамі.

Акрамя партрэтаў партызанаў і іх камандзіраў мастакі малявалі партрэты кіраўнікоў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, легендарных герояў грамадзянскай вайны, палітычных і грамадскіх дзеячаў, пісьменнікаў, мастакоў. Асаблівая ўвага надавалася стварэнню вобраза У. І. Леніна. Партрэтам вялікага правадыра пачыналіся артыкулы пра рэвалюцыйнае мінулае нашага народа, пра поспехі ў сацыялістычным будаўніцтве.

У партызанскіх рукапісных выданнях сустракаюцца партрэты І. Сталіна, К. Варашылава, М. Будзённага.

У часопісе «Камсамольская іскра»[9] мастак Ф. Заленка змясціў партрэты К. Маркса, С. Кірава, Я. Свярдлова, М. Горкага, Т. Шаўчэнкі, М. Гогаля. Часопіс піша пра жыццё і дзейнасць кожнага з іх. І хоць гэтыя партрэты — у асноўным копіі з газетных, кніжных фотаздымкаў і малюнкаў, у творчасці партызанскіх мастакоў яны набываюць новае значэнне.

Мастакі звярталіся да вобразаў славутых рэвалюцыянераў і палкаводцаў, легендарных герояў мінулых войнаў, каб праз іх партрэты выявіць адносіны савецкага чалавека да падзей мінулага, раскрыць пераемнасць вялікіх гістарычных перамог і масавага гераізму нашага народа.

Вялікая любоў да роднай зямлі, вераломнае нашэсце ворага, небяспека, якая навісла над нашай Радзімай, адлюстраваныя ў пейзажах партызанскіх мастакоў. Пейзаж адыгрывае значную



Невядомы мастак. Малюнак у партызанскім часопісе «Разгром».

ролю ў большасці малюнкаў. Ён звязвае прадметы або дзеянні ў адзіную кампазіцыю, падкрэслівае, а часам і выяўляе эмацыянальны зарад у адлюстраванні таго ці іншага дзеяння. Пейзаж у партызанскай самадзейнай графіцы не толькі перадае хараство прыроды. Галоўнае яго прызначэнне — выхаванне ў савецкіх людзей любові да сваёй Радзімы. Менавіта глыбокі патрыятызм узбагачае пейзажы самадзейных мастакоў.

На старонках рукапісных часопісаў сустракаюцца розныя па характару, скіраванасці і сіле гучання пейзажы. Лірычныя — калі мастакі расказваюць пра шчаслівае перадваеннае жыццё, суровыя — калі мы бачым на іх палаючыя гарады і вёскі. Для сваіх замалёвак партызанскія мастакі актыўна ўжываюць гуаш, акварэль, каляровыя алоўкі і гэтым надаюць ім пэўную гучнасць і дэкаратыўнасць.

Пейзажы Ф. Заленкі ілюструюць артыкул «25 гадоў БССР» у часопісе «Камсамольская іскра»[10]. Асаблівай цеплынёй напоўнены малюнкі даваеннага жыцця: прыгожыя ўрадлівыя палі, новыя заводы і фабрыкі, дзіцячыя сады і школы... А потым мы бачым, як гараць беларускія вёскі, гарады, як варожыя боты топчуць родную зямлю,— у жыццё савецкіх людзей уварвалася злавесная вайна.

Большасць графічных твораў партызанскія мастакі малявалі з натуры ці па свежых уражаннях, таму яны ўяўляюць сабой каштоўны дакументальны матэрыял. Варварства фашысцкіх захопнікаў на савецкай зямлі раскрывалася ў простых, але да болю ўражальных малюнках. На адным з такіх аркушаў, напрыклад, Ф. Заленка малюе жудасную карціну расправы фашыстаў з жыхарамі беларускай вёскі Лужыцы, якія дапамагалі партызанам: пяклі хлеб, мылі бялізну, забяспечвалі вопраткай. Каваль Адась рамантаваў вінтоўкі, аўтаматы, майстраваў партызанскія гарматы. Фашысты даведаліся



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




Невядомы мастак. Малюнак у партызанскім часопісе «Разгром».

пра дапамогу партызанам і жорстка расправіліся з жыхарамі гэтай вёскі. Спалілі ўсе хаты. Каваля і яго сыноў павесілі. Штрыхамі перададзены сілуэты чорных камінoў і абгарэлыя дрэвы. Бязлюдная, змоўклая вёска выклікае пачуццё бязмежнай горычы і гневу.

Гэткім жа трагізмам напоўнена і работа С. Гуткоўскага ў часопісе «Удар з тылу»[11]. Малюнак ілюструе артыкул «Новы еўрапейскі парадак у вёсках Беларусі». Стала папялішчам квітнеючае сяло. На заснежанай былой вуліцы адны чорныя пячныя каміны. На абгарэлым дрэве гайдаецца ад ветру павешаны жыхар. У артыкуле гаворыцца: «Акупіраваўшы Беларусь, разбамбіўшы створаныя ў выніку 20-гадовай плённай працы квітнеючыя гарады і культурныя цэнтры, спаліўшы тысячы вёсак... гітлераўцы абвясцілі, што яны з'явіліся ахоўнікамі еўрапейскага парадку». Яшчэ адзін пейзажны малюнак С. Гуткоўскага сугучны з папярэднім. У той самай тэхніцы аўтар зноў паказвае спаленую вёску. На пярэднім плане — жанчына з дзіцем. Яна паспела ўцячы ад карнікаў у лес, а калі вярнулася назад, убачыла свой родны кут зруйнаваным.

Вобразны лад, эмацыянальны тон пейзажаў заснаваны на асабістых перажываннях, горы і стратах. Яны не толькі фіксавалі ўбачанае, але і выкрывалі звярыную сутнасць фашызму, яго варварскія, антыгуманныя мэты.

Важнае месца ў партызанскім друку надаецца сатырычным малюнкам. Кожны часопіс альбо насценная газета мелі раздзелы «Сатыра і гумар». У гэтых жанрах шматбакова раскрыўся талент самадзейных творцаў. Нават тое, што мастакі часам недасканала валодалі малюнкам, не было перашкодай у стварэнні вострасатырычных, эмацыянальных графічных работ.

Больш за ўсё перапала ў сатырычнай графіцы верхаводам рэйха, афіцэрам і салдатам фашысцкай арміі. Гратэскавае завастрэнне, гіпербалізацыя асобных эпізодаў і момантаў давалі магчымасць партызанскім мастакам выкрываць самае істотнае. Фашысцкіх катаў часта малявалі ў выглядзе жывёлападобных пачвар, і яны выклікалі смех і агіду. Сярод шматлікіх сатырычных малюнкаў, што дайшлі да нас, ёсць вялікія і маленькія, ілюстратыўныя і «незалежныя». Відавочная тая сіла вобразнага пераасэнсавання, метафарычнага абагульнення, якая зыходзіла з глыбіні народнага мыслення.

У гэты жорсткі, цяжкі ваенны час на карту барацьбы з ворагам было пастаўлена ўсё. Свежыя нумары газет, баявыя лісткі, лістоўкі выклікалі прыўзнятасць, бадзёрасць і заўсёды — ажыўленне, смех. Смех таму, што мастакі ў раздзелах «Сатыра і гумар» называлі рэчы сваімі імёнамі. Тут раскрывалася праўда жыцця, жыцця рэальнага, суровага. У самы разгар вайны, калі гітлераўская армія яшчэ ішла ў наступ, у творчасці партызанскіх мастакоў-сатырыкаў яна была разбітая і знішчаная. У якіх толькі выглядах і вобразах не прадстаўляліся Гітлер і яго саўдзельнікі! Пра іх напісаны цэлыя паэмы, вершы і частушкі з вострасатырычнымі, трапнымі малюнкамі. Нагадаем радкі з верша, што праілюстраваны серыяй лаканічных, цікавых карыкатур на Гебельса:[12]

Гебельс, Гебельс, дзе ты дзеўся?
Ды няўжо ты чым аб'еўся?
А мо раптам захварэў?
Ці язык твой заржавеў?
Ах, як зімою ты стараўся,
У пракоркі запісаўся.
І прарочыў: «Мы вясной —
Будзем нават за Масквой...»

Графічныя накіды вельмі ўдала дапаўняюць змест верша.

Своеасаблівую трактоўку «азадачанага» Гітлера прадставіў партызанскі мастак Я. Дзятлаў на старонках часопіса партызанскай брыгады «Полымя» «Народны мсцівец»[13]. У адным з іх («Галоўная вуліца Берліна») аўтар паказвае, як збянтэжаны Гітлер, бо вылез са свайго бункера і чухае лоб: не можа ўцяміць, дзе галоўная вуліца Берліна.

На другім малюнку мы бачым, як Гітлер са сваімі «памочнікамі» напяў усю сілу, каб скрануць з месца рэшткі «ваеннай машыны». Але гледачу ясна, што гэта не ўдасца — ад машыны ўжо нічога не засталося. Тут аснова зместу раскрываецца з дапамогай сімволіка-алегарычных сродкаў: праз умоўнае графічнае адлюстраванне аўтар выходзіць да філасофскіх абагульненняў.

Мастакі ўмелі прапусціць праз прызму гумару і баявыя паходы народных мсціўцаў, ваенную падрыхтоўку, свой побыт. Гэта дапамагала выхаваўчай рабоце сярод асабовага саставу, спрыяла падтрымцы бадзёрасці байцоў.



К. Міненка. У. Юданаў з сябрам пад моцным агнём праціўніка выносяць з поля бою параненага камандзіра.

Значнае месца ў творчасці партызанскіх самадзейных мастакоў займае плакат. І хоць ён не заўсёды вылучаўся як самастойны твор, але меў вялікае мабілізуючае, агітацыйнае значэнне.

У час Вялікай Айчыннай вайны плакат «ішоў у наступленне разам з часцямі Савецкай Арміі, агітаваў на заводах за ўзмоцнены выпуск абароннай прадукцыі, у калгасах — за забеспячэнне фронту харчаваннем, ён быў у партызанскіх атрадах, разам з перадавымі часцямі ўваходзіў у вызваленыя гарады, трапляў нават у варожы стан, дзе праводзіў агітацыю сярод салдатаў праціўніка»[14].

Партызанскія плакаты, часам паўто-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раныя ў некалькіх экземплярах, нечакана з'яўляліся ў людных месцах.

Ніводзін рукапісны часопіс, баявы лісток ці насценная газета не абыходзіліся без плакатных малюнкаў. Яны не вылучаліся на сваіх намерах сярод іншых замалёвак, але былі вырашаны як плакаты з уласцівымі ім умоўнасцямі, сімволікай. Малюнкі мелі вобразна-алегарычны характар, былі выкананы проста, лаканічна. Тэкст быў гранічна кароткі, прызыўны: «Смерць нямецкім захопнікам!», «Раздавім фашысцкую гадзіну!», «Ворага на штыкі!», «Няхай жыве наша гераічная Чырвоная Армія!», «Уперад да перамогі!», «За Радзіму!» і іншыя.

Так, у часопісе «Народны мсцівец» малюнак-плакат «Няхай жыве наша гераічная Чырвоная Армія!» паказвае сустрэчу савецкага воіна з селянінам на фоне Чырвонага сцяга. У вобразе селяніна ўвасабляецца савецкі народ, які вітае Чырвоную Армію, што вызваляе гарады і вёскі нашай краіны ад



К. Міненка. У час адпачынку ў клубе.

нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На заднім плане паказаны савецкія танкі і самалёты, якія ідуць у наступ на ворага. Плакат намаляваны акварэллю і чорнай тушшу, ён вылучаецца прыўзнятым настроем, дынамікай руху.

Гэткай жа экспрэсіўнасцю насычаны плакат «Смерць нямецкім захопнікам!» у часопісе «Кутузавец». Савецкія войскі наступаюць. У паветры нашыя самалёты. Магутныя танкі, за якімі рухаюцца чырвонаармейцы, знішчаюць тэхніку і жывую сілу праціўніка. «Толькі наперад!» — гэтыя словы можна прачытаць у самой канструкцыі малюнка, дзе аўтар паказаў пераможнае наступленне Чырвонай Арміі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

Інакш вырашаны плакат на першай старонцы часопіса «Чапаевец». У ім ёсць алегарычная вобразнасць. Гітлераўскі фашызм увасоблены ў выглядзе чатырохгаловай змяі. Гэтая пачвара імкнецца схапіць савецкага конніка. Але адна за адной адлятаюць убок галовы, адсечаныя вялізным мячом нашага воіна. Тэкст узмацняе напружанне і прадказвае вынік барацьбы. Такое кампазіцыйна вобразнае вырашэнне не было новым. Плакат шмат у чым сугучны з плакатам «Раздавім фашысцкую гадзіну!», які намаляваў таленавіты самадзейны мастак В. Букаты яшчэ ў пачатку вайны.

Малюнкі-плакаты змяшчаліся ў часопісах, насценных газетах, баявых лістках. Часта, перамаляваныя адтуль, паўтораныя ў некалькіх экземплярах, яны пераходзілі з рук у рукі, іх бралі на баявыя заданні, распаўсюджвалі сярод насельніцтва акупіраваных гітлераўцамі вёсак. Акрамя прызыўнага тэксту, які меўся на плакаце, на ім часта змяшчалася інфармацыя пра становішча на франтах, пра наступленне Чырвонай Арміі, пра злачынствы фашысцкіх карнікаў на часова захопленых тэрыторыях. Агітацыйная скіраванасць партызанскіх плакатаў мела вялікую мабілізуючую сілу сярод насельніцтва. Яны заклікалі да барацьбы з ворагам, раскрывалі злачынныя задумы фашыстаў, аб'ядноўвалі і натхнялі тысячы людзей на подзвігі ў імя перамогі.

Плакаты малявалі тыя ж, хто афармляў часопісы і іншыя рукапісныя выданні. І хоць не ўсе плакаты былі вытрыманы ў «адпаведным» стылі, значэнне іх аператыўнага водгуку на жыццёвыя падзеі не зніжалася. Мастакі працавалі ўдумліва, з любоўю. Кожны артыкул, напісаны партызанскім карэспандэнтам, як правіла, аздабляўся маляванымі загалоўкам, застаўкай, канцоўкай. Застаўкі на пачатку тэксту былі арганізуючым момантам таго ці іншага эпізоду, інфармавалі выяўленчымі сродкамі пра канкрэтныя падзеі. Канцоўкі падводзілі вынік усяму таму, пра што пісалася ў артыкуле.

Як элементы мастацкага афармлення ўжываліся раслінныя і геаметрычныя арнаменты, у большасці ж выпадкаў — беларускі нацыянальны арнамент. Ім аздабляліся вокладкі часопісаў і старонкі з тэкстам.

У гады вайны на творчасць партызанскіх графікаў актыўна ўплывала



Л. Дзятлаў. Партрэт рэдактара партызанскага часопіса «Полымя» І. Крайніка.

прафесійнае мастацтва. Большасць маляваных плакатаў, сатырычных кампазіцый была запазычаннем з паліграфічных выданняў. Часта самадзейныя мастакі паўтаралі матывы твораў вядомых майстроў плаката, карыкатуры, але рабілі гэта па-свойму, інтэрпрэтуючы мастацка-вобразныя схемы і канструкцыі ў новым зместавым вытлумачэнні. У графічнай канкрэтнасці і, часам, наіўнай тыпізацыі эпізодаў і з'яў раскрываўся народна-паэтычны дух мастацкага мыслення.

Творчасць партызанскіх мастакоў, як паказвае даследаваны матэрыял, мае сапраўды гістарычнае значэнне. Графічныя малюнкі, партрэты народных мсціўцаў, кампазіцыі баявых дзеянняў, сатырычныя замалёўкі раскрываюць гераічныя старонкі гісторыі савецкага народа ў цяжкія ваенныя гады.

Мастацтва партызанскіх графікаў пераканаўча даказала, што Вялікая Айчынная вайна не толькі не спыніла творчасць народных мас, а наадварот, надала ёй у гэтыя гады своеасаблівы напрамак. Яркія, разнастайныя па творчых пошуках работы сцвярджаюць актыўнасць мастакоў-аматараў у сферы выяўленчай самадзейнасці. Сёння яны з'яўляюцца невычэрпнай крыніцай патрыятычнага выхавання нашай моладзі.

---

[1] Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. (Бел. дзярж. МГВАВ). Інв. № 13297, с. 19. (У далейшым будуць азначаны толькі інвентарныя нумары архіва з указаннем старонак).
[2] Інв. № 13327, с. 29.
[3] Інв. № 13211, с. 42.
[4] Інв. № 35266, с. 17.
[5] Інв. № 13302, с. 7, 11, 15.
[6] Інв. № 13337, с. 3.
[7] Інв. № 13343, с. 5, 7, 10.
[8] Інв. № 13211, с. 8.
[9] Інв. № 13299, с. 5—11.
[10] Інв. № 13225, с. 7—14.
[11] Інв. № 13227, с. 73, 85.
[12] Інв. № 13230, с. 28.
[13] Інв. № 13213, с. 16.
[14] История советского искусства, т. II. М., 1968, с. 9.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ